БЕЛАРУС

Выдае Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне у ЗША
Published by Byelorussian - American Association, Inc.
Address — Адрыс: Byelorussian-American Association, Inc.
385 Alabama Ave, Apt. 17, Brooklin 7, New York, U. S. A.
Падпіска на год $ 2.50 — Subscription per year — $ 2.50
Рэдагуе Рэдакцыйная Калегія

PRICE 10 ¢ ЧАСАПІС БЕЛАРУСАЎ У АМЭРЫЦЫ BYELARUS — WHITERUTHENIAN (BYELORUSSIAN) NEWSPAPER IN THE USA 10 ЦЭНТАЎ

Год IV. № 22 (46) 25 Сьнежня 1953 г. NEW YORK, N. Y., U. S. A. December 25, 1953 VOL. IV. № 22 (46)

БОЖАЙ МІЛАСЬЦЮ

СЬВЯШЧЭННЫ САБОР ЯПІСКАПАЎ БЕЛАРУСКАЕ АЎТАКЕФАЛЬНАЕ ПРАВАСЛАЎНАЕ ЦАРКВЫ НА ЧУЖЫНЕ

Да ўсечэснога Духавенства, прэпадобнага Манашаства й усіх багалюбівых вернікаў нашых на Чужыне й на Бацькаўшчыне прабываючых

САБОРНАЕ КАЛЯДНАЕ ПАСЛАНЬНЕ

„І нарадзіла Сына Сваяго Першароднага, і Язэп даў Яму Імя: ІСУС" (Мц. I, 25).

УЛЮБЛЕНЫЯ ДЗЕЦІ НАШЫ!

Так сьв. Апостал Мацьвей апавяшчае нам вялікую радасьць: Ісус Хрыстос НАРАДЗІЎСЯ! І зараз жа далей зьвястуе: „Калі-ж Ісус нарадзіўся ў Віфлееме у дні цара Ірада, прыйшлі ў Ерусалім магі з Усходу і кажуць: дзе народжаны Цар Іудэйскі? бо мы бачылі Зорку Яго на Усходзе, і прыйшлі пакланіцца Яму" (Мц. 2, 1-2).

Вялікае дзіва, цудоўная Містэрыя Нараджэньня Месіі-Хрыста сталася з волі Божае. Вялікая радасьць на Небе й на зямлі. Ангелы апавяшчаюць дзіўную навіну бедным Віфлеемскім пастушком і славяць Бога: „Слава на вышынах Богу й на зямлі мір сярод людзей добрае волі" (Лк. 2, 14). І зьзяе ўжо на небе Зорка Віфлеемская, за якою сьпяшаць пакланіцца Дзіцятку тры ўсходнія мудрацы.

Ангелы сьпяваюць Яму й людзям свой радасны гімн, простыя пастушкі сьпяшаць да ясьляў пабачыць дзіўнае Дзіцятка й пакланіцца Яму, далёка з Усходу тры вялікія мудрацы з багатымі дарамі шукаюць Нованароджанага Цара Іудэйскага! А Ён, Валадар Неба й зямлі, ляжыць у бедным верцепе Віфлеемскім, бо ня было Яму месца у гасподзе (Лк. 2, 7). І гэта ня сталася прыпадкова, а паводле пляну Божага, каб ужо Сваім Нараджэньнем паказаць нам, што Ён прыйшоў ня дзеля раскошаў і славы зямное, але каб узяць на Сябе ўсе грахі й немачы нашы й вызваліць нас ад іх нявымоўнымі пакутамі Сваімі, бо сьмерцю на Крыжы.

Ён прыйшоў, каб Сваею Крывёю асьвяціць нас, выбяліць ад грахоў нашых, падняць да вышыняў Нябесных! Таму й зазьзяла на небе Зорка Віфлеемская! Яе сьвятло апавяшчала сьвету пачатак перамогі над цемрай і злом, прымірэньне нас з Айцом нашым Нябесным, пачатак Царства Божага на зямлі, у якім мы ўжо любыя дзеці Яго, як і кажа нам сьв. Пісьмо: „Бо Айцец наш Нябесны прызначыў нас на ўсынаўленьне Сабе праз Ісуса Хрыста з ласкавасьці волі Сваей" (Эф. 1, 5).

І гэтае асьвячаньне прыроды людзкое праз уцелаўленьне Бога ў Чалавека адчула ўсякае стварэньне, навет бяздушная прырода, якая ў гэтую Сьвятую Ноч сваім супакоем аддае хвалу Яму. Тым болей людзі, асабліва хрысьціянскія народы, ня толькі адчуваюць, але й усею душою перажываюць незямную, велічную й радасную тайніцу Містэрыі Нараджэньня Богачалавека, перадусім як крыніцу ўсёабдымаючае й усёперамагаючае Любові! Таму ў гэты Сьвяты Вечар навет зацьвярдзелая ў грахах душа зьмягчаецца, бо навет у яе пранікае праменьчык Зоркі Віфлеемскае, і яна стае лепшай, сьвятлейшай і чысьцейшай, здольнай на пачуцьцё любові. А якую красу й дастойнасьць прадстаўляе ў гэты мамэнт душа пабожнага чалавека, калі ён чуе, або й сам сьпявае, падобна Ангелам, сваю натхнёную песьню: „Ціхі Вечар, Сьвяты Вечар!" Запраўды, Хрыстос з Ангеламі Сваімі ў гэты час між людзямі ходзіць!

Усечэсныя Айцы! Любыя дзеці нашы! У гэтую Сьвятую Ноч пасьпяшылі да ясьляў Дзіцятка бедныя й багатыя, простыя й мудрыя, зблізка й здалёка. Так і нашы продкі заўсёды сьпяшылі ў гэты ціхі, Сьвяты Вечар часамі таксама здалёка да хатаў сваіх, каб тут разам з усімі блізкімі сваімі сабрацца каля стала з пахучым сенам — праобразам ясьляў Дзіцятка, пакланіцца Яму й прынесьці ў дар чысьціню й любоў сэрцаў сваіх. І ў гэты час Сам Хрыстос прабываў з імі. Не забудземся аб гэтым і мы цяпер. Няхай мы й раскіданы па сьвеце далёка ад родных хатаў нашых, а многія з нас тут і там удома не далічацца ў гэты Сьвяты Вечар дзе-кага з блізкіх сваіх, усё-ж будзем хоць духова разам вітаць і славіць Нованароджанае Дзіцятка. Добра вычысьцім і мы душы нашы, каб там у Сьвяты Вечар было адно адзінае пачуцьцё: Любоў! І няхай яна абыймае усіх нашых суродзічаў, навет тых, якія можа нам нейкую крыўду ўчынілі. Так паўстане сярод нас тое адзінства, за каторае маліўся Сам Хрыстос: „Ойча, няхай будуць усе адно: як Ты ўва Мне, і Я ў Табе, так і яны няхай будуць адно" (Іо. 17 21). Тады мы ў гэты Сьвяты Вечар станемся падобнымі Боскаму Дзіцятку, і Хрыстос будзе з намі, і мір Божы ахіне нас.

І калі ў гэты ціхі й Сьвяты Вечар мір Божы запануе ў чыстых сэрцах нашых, зьвернем духовыя вочы свае на пакутуючых братоў нашых там, на паняволенай Радзіме нашай. Наша Маці Беларусь ужо даўно імкнецца да гэтага міру, свабоды Божай. І калі мы ўсе супольна й горача будзем прасіць аб гэтым Нованароджанага Спасіцеля нашага, як крыніцу Праўды, Дабра, Справядлівасьці й Любові, Ён напэўна выслухае нас, бо ніколі веруючы ў Яго ня будзе засаромлены. Споўніцца надзеі нашы, бо ХРЫСТОС НАРАДЗІЎСЯ! Нарадзіўся Той, Каторы перамог зло, няпраўду, паняволеньне. І мы будзем цьвёрда верыць, што Ён паможа нам, калі бы будзем верныя Яму, бо такім Ён Сам сказаў: „Ня бойся, малое стада, бо Айцец ваш упадабаў даць вам Царства" (Лк. 12, 32).

І з гэтай цьвёрдай Верай у Міласэрдзе й Ласку Божую, з непарушнай Надзеяй і палымяннай Любоўю да Яго, вітаем вас, усечэсных Айцы й любыя Браты й Сёстры нашы з Вялікім Сьвятам РАСТВА ХРЫСТОВАГА і з надыходзячым НОВЫМ ГОДАМ. Ён ужо праявіў Ласку Сваю да нас: памог нам аднавіць крыніцу нашае моцы духовае, нашу Сьв. Аўтакефальную Праваслаўную Царкву. Гэтым Ён дае нам добрую надзею на поўную перамогу нашу: аднаўленьне нашае Вольнае Беларусі.


Пасылаем вам нашае Архіпастырскае Багаславеньне. Пашырайце й узмацняйце Любоў у сэрцах вашых, і нязломную Веру й Надзею на Усемагутнага, Нованароджанага Госпада нашага Ісуса Хрыста, бо: „Спадзявайся на Госпада, ідзі шляхам Ягоным, дык узвысіць цябе, каб узяў ты зямлю ў валаданьне, і бязбожных загубу ты ўбачыш" (Пс. 38, 34). Так Госпад Бог радуе верных Сваіх тут на зямлі, і прыгатаваў для іх Карону Славы ў Нябёсах.

Ласка Госпада нашага Ісуса Хрыста, і Любоў Бога і Айца, і Прычасьце Сьвятога Духа няхай будзе з усімі вамі. АМІНЬ.

СЬМІРЭННЫ АРХІЯПІСКАП СЕРГІЙ
Глава Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы

СЬМІРЭННЫ ЯПІСКАП ВАСІЛЬ
Сакратар Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў БАПЦарквы на Чужыне

Дана Року Божага 1953
месяца сьнежня
Аўстралія — Амэрыка



ХРЫСТОС НАРАДЗІЎСЯ!

ДА СУРОДЗІЧАЎ-БЕЛАРУСАЎ

ЖАДАЮ УСІМ НАШЫМ ДАРАГІМ
СУРОДЗІЧАМ-БЕЛАРУСАМ

Вясёлых Сьвятаў,

ШЧАСЬЛІВАГА НОВАГА ГОДУ
И НАЙХУТЧЭЙШАГА ПАВАРОТУ У НАШУЮ ЛЮБУЮ
ВОЛЬНУЮ Й НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ

МІКОЛА АБРАМЧЫК
ПРЭЗЫДЭНТ РАДЫ БНР

ГАЛОЎНАЯ УПРАВА
ЗАДЗІНОЧАНЬНЯ БЕЛАРУСКІХ КАМБАТАНТАЎ І ВЭТЭРАНАЎ

ПЕРАСЫЛАЕ ЎСІМ СВАІМ СЯБРАМ-ВАЙСКОЎЦАМ
НАЙШЧЫРЭЙШЫЯ ПАЖАДАНЬНІ

ШЧАСЬЛІВАГА НОВАГА 1954 ГОДУ

НАШ ІДЭАЛ — ЗБРОЙНАЕ ЗМАГАНЬНЕ ЗА ВЫЗВАЛЕНЬНЕ НАШАГА НАРОДУ З КАМУНІСТЫЧНАЙ НЯВОЛІ.

ХАЙ-ЖА СТАНЕЦЦА Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ ПРАЎДАЙ.

ХАЙ-ЖА ПРЫНЯСЕ НАМ ГЭТЫ НОВЫ ГОД РАДАСЬЦЬ УКРОЧЫЦЬ ІЗ ЗБРОЯЙ У РУКАХ У НАШУЮ БАЦЬКАЎШЧЫНУ И СПРЫЧЫНІЦЦА ДА ЕЙНАГА ВЫЗВАЛЕНЬНЯ.

ГАЛОЎНАЯ УПРАВА
БЕЛАРУСКІХ КАМБАТАНТАЎ І ВЭТЭРАНАЎ

МІР НА ЗЯМЛІ

— „Слава на Узвышшах Богу, а на зямлі мір"... Гэткімі словамі віталі паводле Эвангелі пастухоў анёлы, абвяшчаючы ім аб Віфлеемскіх цудоўных Нара зінах блізу дзьве тысячы год таму. „На зямлі мір" — супакой, дабрабыт, узаемны давер, ціхая праца, задаваленьне... Ці-ж патрэба што іншае сьвету, каб ён быў шчасьлівы? Здаецца, шчасьце гэтае гэткае сьціплае, дасягальнае, што каб зьдзейсьніць яго не патрэба нічога, апрача драбочка добрае волі. І, аднак, заправуднага, агульнага шчасьця, міру на зямлі ня было яшчэ ніколі. Крывавыя войны пустошылі сьвет, абярталі ў шэрыя папялішчы багатыя гарады, зьмяталі з аблічча зямлі цэлыя народы спрадвеку, і перад нарадзінамі ў Віфлееме Таго, Каго славіла сваім радасным гімнам анельскае войска, і... пасьля іх.

Навет, калі параўнаць падзеі далёкага мінулага із пазьнейшымі, дык даводзіцца пагадзіцца з высновам, што апошнія дзьве тысячы год былі яшчэ больш крывавымі й зьнішчальнымі, чымся паганская даўніна. Бо ці-ж ня зьбірае год па годзе сьмерць усё багацейшае жніво на палёх змаганьня сьвету? Ці-ж ахвярамі крывавых непаразуменьняў між народамі не стаюцца што раз часьцей ня толькі тыя, якія самі нясуць сьмерць, усё адно, ці нападаючы, ці бронячыся, але й іхныя мірныя сем'і, малыя дзеці? Ці ж даўнейшыя сотні, тысячы не ся нулі мільёнаў ахвяраў у гады жудасных апошніх войнаў? Ці-ж відаць канцы гэтага братабойства?

Адказаць на гэтыя пытаньні — значыцца прызнацца да віны. Да віны, якая тым трагічнейшая, што ўсё гэтае нясьціханнае ўсеагульнае змаганьне за перавагу дужых над слабейшымі, апанаваных прагаю над задаволенымі малым, вядзецца сяньня найчасьцей пад узьнёслымі клічамі: „За свабоду", „У абароне паняволеных", „За праўду й справядлівасьць", хоць нічога, апрача няволі, прыгнечаньня й несправядлівасьці дагэтуль сьвету ня прынесла.

Найлепшым прыкладам гэтага можа быць тое, што давялося перажываць нашаму сучаснаму пакаленьню. Першаю праявою згаданае трагічнае нязгоды паміж клічам, у імя якога было ўзьнятае змаганьне й ягонымі вынікамі зьяўляецца практыка расейскага камунізму, які прынёс сьвету нячуванае дагэтуль патаптаньне ўсяго, у што верыла дагэтуль чалавецтва. Іншым прыкладам можа быць нямецкі нацызм із ягонымі нялюдзкімі ідэямі.

Нацызм, праўда, існаваў нядоўга й сяньня засталіся па ім адно крывавыя ўспаміны ды нязьлічаныя ямы-магілы з сотнямі тысяч замучаных да сьмерці людзей. Але праводжанае напрацягу 36 год нарадагубства чырвонае Масквы, на жаль, ня пала, як нацызм. Масква жыве й нясе свой крывавы сьцяг сьмерці усё далей. І ніколі яшчэ пашана да людзкое адзінкі, цана чалавеку, цана людзкога жыцьця не расцэньвалася на рынку сьвету гэтак нізка, як сяньня, дарма, што мы й сяньня, як штогод напрацягу дзьвёх тысячаў бяз малага Калядаў сьпяваем анельскае слаўленьне: „Слава ў вышы Богу, а на зямлі мір".

Ці вінная гэтаму, як рады цяпер наракаць сьвет, адно Зялезная Заслона? Ці вінны гэтаму адно маскоўскі камунізм, які імкнецца апанаваць сьвет, пашырыць свае ідэі й мэтады ушчасьліўленьня яго ўсялякімі спосабамі — гвалтам, зьняволеньнем, маною, сьмерцяй? Хіба, не. Бо хто-ж быў творцамі й гітлерызму й камунізму, хто былі самы Гітлер ды Сталін, калі ня людзі, не адны з гэткіх-жа „сыноў чалавечых", як кажны з нас.

Прычына вечнага нясупакою на сьвеце, а вусьціцных сучасных падзеяў асабліва, зусім іншая. Калі прааналізаваць усе прычыны людзкіх няшчасьцяў, што вынікаюць з самагубных войнаў, дык станецца ясным, што ў аснове іх ляжыць нішто іншае, як людзкі эгаізм. Гэты эгаізм глыбака ўкараніўся ў кажнай людзкой адзінцы, у кажнай сям'і, у кажным народзе. Ён якраз змушае дужэйшыя народы панявольваць слабейшыя для сваіх матар'яльных карысьцяў, дзеля задаволеньня сваіх эгаістычных імкненьняў. Яшчэ больш згубным для чалавецтва сталася ўзьнікненьне матарыялістычных тэорыяў, якія адкінулі як непатрэбшчыну, як атруту духовыя вартасьці чалавека й веру ў вышэйшую панадлюдзкую справядлівасьць. Выяўленьнем

Мір на зямлі

гэткага грубога матар'ялізму й стуся расейскі камунізм і нацызм Нямеччыны. Гэта яны, камунізм ды нацызм пабудавалі канцлягеры ўнутры сваіх дзяржаваў, у якіх мільёны людзей сталіся нявольнікамі дзяржаўных рэжымаў, мільёны згінулі ад кулі ў патыліцу, а іншыя мільёны жывых трупаў жыўцом згарэлі ў лягерных крэматорыях. Навонкі-ж згаданая тэорыя грубога матарыялізму камуністых і нацыстых спрычынілася — да паняволеньня цэлых народаў, нясучы пагрозу гэткага-ж паняволеньня і ўсяму сьвету наагул. Гэты грубы матарыялізм якраз і трымае сяньня ў напяцці ўсіх і ўсё, пагражаючы сьвету новай, жахлівейшай за ўсе папярэднія, вайною. Ён змушае вучоных сьвету высіляць свае мазгі дзеля вынаходу ўсьцяж новых прыладаў сьмерці, як атамныя, вадародныя ды іншыя бомбы, ён непахісна вядзе сьвет да поўнага самазьнішчэньня.

Ісьці далей гэтым сьмяротным шляхам нельга. Надалёкаю канчальнаю мэтаю гэткага запраўднага маршу сьмерці была-б адно неадваротная катастрофа для ўсяго, што жыве.

Таму, трэба знайсьці нейкі новы шлях, нейкія новыя ідэі, якія скалынулі-б сьвет і адчынілі яму вочы на сьмяротную небясьпеку. А знайшоўшы гэты новы шлях паразуменьня, дапамагчы людзкасьці ўзыйсьці на яго. Толькі тады пазнаюць народы сьвету запраўдны мір і супакой, толькі тады зьдзейсьніцца сьветлая песьня Віфлеемскае начы: „Слава ў вышы Богу, а на зямлі мір"... А мы, беларусы, аднойдзем сваю, адабраную ад нас захопнікам, патаптаную й паняволеную Бацькаўшчыну.

У КАМІТЭЦЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ

Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня ад Бальшавізму паведамляе, што кагадзе адбыўся гадавы сход згаданае арганізацыі. Дасюлешні Старшыня Камітэту Адмірал Л. С. Стывэнс перавыбраны Старшынёю на наступны год. Перавыбраны на наступны год і ўвесь урад Камітэту Вызваленьня.

Да 7-ай Сэсіі Рады БНР

У папярэднім нумары „Беларуса" мы абяцалі паінфармаваць нашых чытачоў аб дыскусыях па дакладу прэз. Абрамчыка на тэму нашае вонкавае палітыкі, ці, дакладней кажучы, аб тэй палітычнай акцыі, якая праводзілася напрацягу апошніх 10-цёх месяцаў у Эўропе (Карлсруэ, Парыжу, Мюнхэне).

Дыскусіі гэтыя адбыліся галоўным чынам на трэцім паседжаньні 7-ай Сэсіі (27 й 28 лістапада) й трывалі блізу два дні, нацiскаючы на два аснаўныя пункты:

1) Ацэну працы ў сэнсе тактыкі й палітыкі выканаўчых органаў Рады за прыгаданыя 10 месяцаў наагул і

2) Абмяркаваньне й крытыку запрапанаванага на Мюнхэнскай Канфэрэнцыі Статуту МАКЦ-у.

Вось-жа, што да першага пункту, дык пагляды Сэсіі выразна й яскрава выявіліся ў трох кірунках ці групах паглядаў сяброў Рады.

Да першай належалі пагляды абсалютнай бальшыні Радных, якія поўнасьцю падзялялі й падтрымлівалі тактыку й палітыку нашых прадстаўнікоў у Карлсруэ, Парыжу й Мюнхэне й абгрунтоўвалі сваё становішча ў гэтым сэнсе.

Да 2-ой групы належалі сябры, якія таксама ў асноўным поўнасьцю пагаджаліся з пазыцыямі, занятымі нашымі прадстаўнікамі на згаданых канфэрэнцыях, але рабілі засьцярогі прэз. Абрамчыку што да пятрапнага падбору й расстаноўкі людзей у адказьнейшай працы (галоўным чынам у Амэрыцы), чым і тлумачылася іхная дасюлешняя апазыцыя.

3-яя група выказвала пазыцыю Партыі АБНД (Партыі Беларускіх-Нацыянал-Дэмакратаў, якая, паводле асьветчаньня, налічвае 23 Радных, зь якіх, аднак, прысутных на Сэсіі было 5-ёх).

Гэтая група заняла становішча поўнасьцяй адмоўнае. Ніякіх палітычных дасягненьняў у Карлсруэ, Парыжы ці Мюнхэне яны ня бачаць, а наадварот, лічаць усю гэтую справу вельмі шкадлівай для нашай вызвольнай барацьбы.

Дзеля гэтага, на іхную думку, нам трэба блякавацца з гэткімі групамі нацыянальных эміграцыяў, якія займаюць адмоўнае становішча што да супрацоўніцтва з Амэрыканскім Камітэтам, а ня з тымі, якія гэткага супрацоўніцтва ізь ім шукаюць.

Да гэткае пазыцыі сяброў партыі АБНД далучыўся яшчэ адзін сябра Рады, але зь іншага боку двух сяброў партыі, прысутных на залі, салідарызаваліся з першай ці другой вышэй прыгаданымі групамі.

У сваім адказе апанэнтам, прэз. Абрамчык перадусім выявіў сваё задаваленьне з таго, што прамоўцы з другое групы згодныя з пазыцыямі, занятымі нашымі прадстаўнікамі на згаданых канфэрэнцыях, а што да падбору й расстаноўкі людзей, дык адклаў гэтую справу на пазьней, калі будзе абмяркоўвацца справа перавыбараў адпаведных органаў Рады БНР.

Што-ж да становішча, занятага партыяй АБНД, дык прэз. Абрамчык паказаў усю неразважнасьць, а таму й небясьпеку яго для нашай вызвольнай справы, бо гэткай тактыкай мы-б нямінуча давялі сябе да поўнай ізаляванасьці як у дачыненьні да аўтарытэтных нацыянальна-палітычных цэнтраў іншых нерасейскіх народаў, гэтак і ў дачыненьні да тых амэрыканскіх колаў, якія хочуць нам практычна дапамагаць у нашым вызвольным змаганьні. Тым балей мы ня можам ужываць байкоту Амэрыканскага Камітэту цяпер, калі ад гэтае тактыкі адмовіліся некаторыя з нашых сяньняшніх партнэраў з Парыскага Блёку й калі практыка апошніх месяцаў у кірунку шуканьня супрацоўніцтва з Ам. Камітэтам цалкам праўдзіць і дазваляе спадзявацца дасягненьня пастаўленых паня воленымі Масквой народамі мэтаў.

У дыскусіях, прысьвечаных другому пункту справе запраэктаванага статуту МАКЦ-у — дык бальшыня прысутных на Сэсіі сяброў, выказаўшы шэраг сваіх засьцярогаў да некаторых пунктаў праэкту статуту, спыняліся галоўным чынам на 5-ым пункце згаданага статуту, дзе гаворыцца, што „арганізацыі, якія ўваходзяць у МАКЦ не разглядаюць сябе, як зародкі будучых дзяржаўных органаў".

Гэты пункт статуту МАКЦ-у ўсе сябры Рады, прысутныя на Сэсіі, аднагодна палічылі пунктам, які перашкаджае Радзе БНР, ці ейнаму выканальнаму органу — Ураду — уваходзіць, як такім да праэктаванай арганізацыі МАКЦ.

З дыскусіяў на гэтую тэму, якія занялі больш гадзіны часу, выявілася, аднак, што тых падыход да гэтае справы аснаваны на непаразуменьні.

У сваіх адказах апанэнтам прэз. Абрамчык растлумачыў гэтую справу гэтак:

Зусім ня ставілася й не стаіць справа так, хто-колечы з сяброў Парыскага Блёку маніўся ці маніцца ўводзіць у МАКЦ (калі-б ён стаўся запраўднасьцяй) свае дзяржаўныя органы. Ані мы, Рада БНР, ані Рада УНР, ані Грузінскі Экзыльны Урад, ні Армяны ды іншыя, гэтак ніколі ня думалі рабіць.

— Трэба добра сабе усьведаміць, — падчыркваў прэз. Абрамчык, што статут МАКЦ-у укладаўся не для нашых дзяржаўных органаў, а ў тым ліку й не для Рады БНР. Рада БНР мае свой статут і сваю канстытуцыю (нашыя Тры Уставадаўчыя Граматы). Імі Рада БНР будзе й далей кіравацца ў сваёй вызвольнай працы аж да поўнага ейнага зьдзейсьненьня.

Праэктаваная арганізацыя МАКЦ планавалася для вузейшых заданьняў — як каардынацыйны цэнтар антыбальшавіцкай акцыі, як ударны орган, заініцыяваны амэрыканцамі, у які мелі-б увайсьці арганізацыі, якія **ня маюць характару дзяржаўных фармацыяў.**

Паўстаньне гэткага баёвага міжнацыянальнага органу дзеля **канкрэтнай антыбальшавіцкай працы,** накіраванага на ліквідацыю бальшавізму, ня толькі нічым не пярэчыць паралельнаму існаваньню экзыльных дзяржаўных органаў, а якраз вельмі ім дапамагае.

Ніколі і ні ў кога ані ў часе Мюнхэнскай канфэрэнцыі, ані ў прыватных гутарках, як з боку сяброў Камісіі, што апрацоўвалі праэкт статуту МАКЦ-у, гэтак і з боку Амэрыканцаў ня ставілася дамаганьні, каб сябры Парыскага Блёку разьвязвалі свае Рады, Урады й г. п.

Тое-ж, што у Мюнхэнскай Канфэрэнцыі прынялі ўдзел кіраўнікі дзяржаўных экзыльных органаў, якія працавалі й над статутам МАКЦ-у, у які ня зьбіраліся ўводзіць свае экзыльныя ўрады, — справа зусім зразумелая й нармальная.

Не здалася-б яна ненармальнай і каждаму, хто-б уважней прыгледзіўся да іншых міждзяржаўных дачыненьняў наагул.

Прэз. Абрамчык даў далей колькі наглядных гэтага прыкладаў, адзін зь якіх гэтта й зьмяшчаем:

Прыкладам, — казаў прэз. Абрамчык, — усім ведама, што два гады таму адбылася канфэрэнцыя кіраўнікоў урадаў Заходня-Эўрапэйскіх дзяржаваў, на якой было асягненае паразуменьне аб стварэньні г. зв. Заходня-Эўрапэйскага Фэдэральнага Парляманту, сядзібай якога меў быць Страсбург. Для гэтага міжнацыянальнага парляманту была апрацаваная канстытуцыя, а сама ўгода аб ставарэньні міжнацыянальнага эўрапэйскага парляманту была пазьней ратыфікаваная парлямантамі Ангельшчыны, Францыі, Бэльгіі й інш. Аднак, гэта зусім не азначала, што меліся быць зьліквідаваны Ангельскі ўрад, Французкі, ці Бэльгійскі зь іхнымі парлямантамі, хоць прыгаданы міжнацыянальны парлямант атрымліваў шмат большыя й шырэйшыя паўнамоцтвы, чымся створаны намі МАКЦ у дачыненьні да нашых Радаў і ўрадаў.

Далей прэз. Абрамчык зазначыў, што 5 пункт статуту МАКЦ-у ня быў ідэяй расейскіх групаў. Уведзены ён быў якраз зь ініцыятывы Грузінскага ўраду яшчэ некалі ў статут КЦАБ-у (крыху, праўда, у іншай форме) і быў накіраваны якраз супраць расейцаў, якія маніліся ператварыць КЦАБ у нешта накшталт будучага парляманту народаў СССР, супраць чаго грузіны пратэставалі, бачачы ў гэтым небясьпечнага канкурэнта для свайго экзыльнага ўраду.

Дзеля гэтага ня трэба блытаць міжнацыянальных арганізацыяў, прызначаных для адмысловых заданьняў тыпу МАКЦ-у ці іншых, якія могуць і будуць паўставаць, із паралельна існуючымі дзяржаўнымі экзыльнымі органамі ці **блёкамі** падобных органаў (прык. Парыскі Блёк), якія маюць зусім іншыя, шмат шырэйшыя заданьні.

Пасьля дыскусіяў Сэсія Рады ўзгодніла пастанову што да праводжанай выканаўчымі органамі Рады вонкавай палітыкі. Пастанова гэтая будзе абвешчана з вынікамі галасаваньня пасьля таго, як у справе гэтае пастановы выкажуцца тыя Сэктары Рады, якія на гэтае пытаньне ня выказаліся.

4-ае паседжаньне 7-ай Сэсіі Рады адбылося 20 сьнежня. На паседжаньні гэтым былі пачатыя нутраныя справы — заслуханыя справаздачы Прэзыдыюму Рады і Ураду БНР.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ СВАБОДЫ Й МІРУ

4-га й 5-га сьнежня 1953 г. у Вашынгтоне адбывалася канфэрэнцыя, у якой узялі ўдзел прадстаўнікі ад 50 розных палітычных, грамадзкіх, прафэсыйных і рэлігійных арганізацыяў ЗША. Усіх дэлегатаў, лічачы гасьцей і наглядальнікаў, было на салі каля 250 асобаў.

Канфэрэнцыя гэтая ўжо ня першая. Гэткая-ж канфэрэнцыя адбылася была ўжо ў лютым мінулага году ў Вашынгтоне пад назовам „Стратэгія псыхалягічнай вайны".

Ініцыятарамі й арганізатарамі абедзьвух прыгаданых канфэрэнцыяў былі: кангрэсмэны Чарл Кэрстэн і О. К. Армстронг і Э. М. О'Конар — б. урадавец Вашынгтонскай Цэнтралі ДП Камісіі.

Апрача іх у канфэрэнцыі ўзялі актыўны ўдзел каля трох дзясяткаў іншых выдатнейшых амэрыканскіх палітычных, культурных і царкоўных дзеячоў, у большай ці меншай меры азнаёмленых з нацыянальнай праблемай у СССР. Між імі былі прафэсары амэрыканскіх унівэрсытэтаў, журналісты й навет два вышэйшыя вайскоўцы — адмірал і гэнэралмаёр.

У сямідзесяцёх, прыблізна, процантах усе, хто выступаў з дакладамі ці забіраў голас у дыскусіях, выразна выказалі свае сымпатыі да паняволеных Масквою народаў, што імкнуцца вызваліцца з пад расейскага панаваньня. У гэтым духу ў канцы канфэрэнцыі была прынятая й рэзалюцыя (якая да рэчы ня была разданая, але якую арганізатары канфэрэнцыі прыраклі пазьней апублікаваць).

Ад Беларуска-Амэрыканскага Задзіно-

(Канец на 3 бач.)

На парозе Новага Году

Год 1953 азначыўся зьменамі першараднай палітычна-гістарычнай вагі. Дзеля гэтага добра будзе на парозе Новага 1954 Году азірнуцца назад, падлічыць важнейшыя факты й здарэньні году мінулага ды падцеміць кірунак палітычнага разьвіцьця як агульна-сусьветнага, так і нашага беларускага жыцьця.

I.

Сусьветныя падзеі ў мінаючым годзе вызначыліся паважнымі, магчыма навет пераломнымі, зьменамі, якія могуць моцна заважыць на далейшым ходзе гістарычнага разьвіцьця сьвету.

Адзін зь іх, гэта факт зьмены галоўнага кіраўніцтва дзьвёх найдужэйшых ды насупроць сябе стоячых палітычных сілаў сьвету — Злучаных Штатаў Амэрыкі ды Савецкага Саюзу.

У ЗША зьмянілася ня толькі кіруючая верхавіна, але й кіруючая партыя ў выніку прайграных дэмакратамі выбараў у восені 1952 г. Зьмена усёй палітычнай адміністрацыі напэўна шмат палегчыла новаму кіраўніцтву й справу правядзеньня кардынальных зьменаў у нутраной, а перадусім вонкавай палітыцы ЗША. Калі-б дэмакратычная партыя засталася пры ўладзе, яна із сваім старым адміністрацыйным апаратам ды перадусім старой тактыкай напэўна-б не здабылася на актывізацыю амэрыканскай вонкавай палітыкі, якая перадала ў рукі ЗША вядучую палітычную ініцыятыву.

У СССР з прычыны сьмерці дыктатара кіраўніцтва дзяржавай таксама было перанятае іншым чалавекам, хоць сама партыя й агульны кірунак палітыкі й надалей асталіся пры старых, традыцыйных бальшавіцкай Маскве, канцэпцыях. Маленкову давялося толькі, у змаганьні за абсалютную дыктатарскую ўладу, адсунуць ды зьліквідаваць толькі параўнальна невялікую групу прыхільнікаў свайго канкурэнта Берыі, разам зь ім самым. Час і сілы патрачаныя на нутраное змаганьне за дыктатарскі пасад ды на ўмацоўваньне страхам ды дробнымі эканамічнымі ўступкамі савецкім грамадзянам аўтарытэту новага дыктатара, былі часткова выкарыстаныя (хоць далёка ня поўна) Захадам для замацаваньня сваіх палітычных пазыцыяў ды для спробы пераняцьця ў свае рукі галоўнай палітычнай ініцыятывы, якая ад канца мінулай вайны ўвесь час была ў руках Масквы.

Вось факт самой зьмены дыктатара ў Саветах значна дапамог ЗША ды Айзэнгаўэру пераняць ініцыятыву ў сусьветнай палітыцы ў свае рукі, як гэта паказалі асабліва апошнія месяцы 1953 году. Савецкую сусьветную пазыцыю значна падсеклі й няўдачы таталітарна-калініяльнай палітыкі Масквы ў сатэлітных краінах, што зырка праявілася перад усім сьветам работніцкімі страйкамі ды бунтамі ў Усходняй Нямеччыне, Чэхаславаччыне ды іншых краінах бальшавіцкай акупацыі.

Вялікаю прайгранаю Масквы быў таксама факт упадку Масадэка ў Іране ды зьмены іранскага палітычнага кіраўніцтва з авантурна-прасавецкага на становўка антысавецкае. Дзеля асаблівага важнага стратэгічнага палажэньня Ірану пройгрыш гэты для Масквы нязвычайна балючы. Ён аслабіў савецкі палітычны наступ на гэтак званым „блізкім Усходзе".

Замірэньне ў Карэі, нягледзячы на ўсе камплікацыі, ды натугі Масквы выцягнуць сабе якнайбольшыя карысьці з гэтага замірэньня, ёсьць таксама ня чым іншым, як паразаю Саветаў, адступленьнем на выхадныя, даваенныя пазыцыі.

На руку Саветам у мінулым годзе затое й надалей быў нястача адзінства сярод заходніх саюзьнікаў, купецкая „мараль" некаторых зь іх, якая дазваляе ім браць удзел у Карэйскай вайне ды адначасна вясьці гандаль з Кітаем ды дастаўляць яму сродкі на вядзеньне гэтай вайны.

Важкім мілітарным асягненьнем Масквы трэба лічыць і апавешчанае выпрадукаваньне першае вадароднае бомбы Саветамі, якое, калі гэта ня толькі прапаганда, а праўда, ёсьць вынікам выкраданьня тайнаў атамнай бомбы ад аліянтаў, а не сваім собскім тэхнічным асягненьнем. Гэта аднак не зьмяняе таго канкрэтнага факту, што бальшавіцкія гангстэры вайны маюць у сваіх руках гэтую найстрашнейшую зброю XX стагодзьдзя й пры кажнай нагодзе будуць прабаваць шантажаваць ёю дэмакратычны сьвет, асабліва слабейшыя, палахлівыя народы.

З гэтага, вельмі агульнага, перагляду фактаў бачым, што мінулы год адзначыўся ў сусьветным жыцьці пераходам савецкай палітыкі наступу ў абарону ды ўзьвялічанай актыўнасьцяй і ініцыятывай ЗША ды Айзэнгаўэра. Дзяржаўны сакратар Даллес у канцы году прырок, што будучы год мае быць годам яшчэ важнейшых ходаў і падзеяў, у што, судзячы па першым годзе адміністрацыі Айзэнгаўэра, можна паверыць.

II.

Злучаныя Штаты Амэрыкі таксама перажывалі вялікія нутраныя перамены, спрычыненыя гэтаксама ў вялікай меры фактам замены дваццацігоднага дэмакратычнага кіраўніцтва на новае рэспубліканскае.

Для нас мае асаблівую вагу вельмі выразна зазначаная эвалюцыя паглядаў амэрыканскіх вядучых палітычных і навуковых кругоў на гістарычную сутнасьць і палітычныя пэрспэктывы шматнацыянальнай савецкай імпэрыі.

У гэтым годзе зырка праявіўся далейшы адыход ад падсуненых ды умацоўваных расейскімі коламі паглядаў на нібы абсалютную неабходнасьць захаваньня гэтай імпэрыі ды пакіненьне на ласку й няласку Масквы дзесяткоў паняволеных нерасейскіх народаў. Эвалюцыя паглядаў была такая відавочная, што расейскія вялікадзяржаўныя правадыры забілі трывогу ды замітусіліся ў новай няўдалай спробе паўстрымаць няпрыхільную сабе эвалюцыю амэрыканскай публічнай апініі.

З глыбейшым вывучэньнем ды пазнаваньнем справаў Усходняй Эўропы сяньня й у Амэрыцы даходзіць да сьведамасьці той знаны нам факт, што Савецкая дзяржава ня нейкае адналітае нацыянальна цэлае, а тыповая імпэрыя з дзесяткамі падбітых народаў, да якіх і надалей тарнуецца тыповая каляніяльная палітыка эканамічнага выкарыстаньня ды палітычна-нацыянальнага прыгнёту Як далейшы вынік гэтага усьведамленьня прыходзіць і лягічны вывад, што й гэтая імпэрыя, як усе іншыя, з агульна-людзкім поступам мусіць распасьціся на свае натуральныя складовыя часткі ды прывесьці да свабоды ўсіх паняволеных сяньня бальшавікамі народаў.

Зьмена паглядаў зазначылася ў друку, у такіх выступленьнях, як канфэрэнцыя паняволеных народаў Эўропы ў Вашынгтоне, як прамова кіраўніка „Голасу Амэрыкі" аб тым, што галоўны вораг вольнага сьвету сяньня — расейскі імпэр'ялізм, які як зброяй свайго наступу карыстаецца камуністычнаю прапагандаю. Зьме-

Беларускія Калядныя Гульні

Вясёла, бесклапотна, із шчырым гумарам сьвяткаваліся некалі Калядныя Сьвяты ў Беларусі. Пасьля ўрачыстае Куцьці, пасьля першага дню Калядаў, пасьля першага Каляднага вечару, калі уся ваколіца аж зьвінела мэлёдыямі чароўных то, шчыра-чульлівых, то паважна-ўрачыстых беларускіх калядкаў, надыходзілі г. зв. Сьвятыя вечары, прысьвечаныя багатым калядным звычаям ды гульням. Пачыналіся гэтыя гульні, звычайна, на другі дзень Калядаў, калі па хатах пачыналі хадзіць „хлапцы з казою", „цыганы зь медзьвядзем", „кабылай", „журавель" ды інш. Усе гэтыя гульні вымагалі ўдзелу вялікае грамады выканальнікаў, сьпявакоў, музыкаў ды такое-сякое падрыхтовы.

Моладзь, якая падрыхтоўвала калядныя гульні, выяўляла часам не абы-якія артыстычныя здольнасьці. Выяўляліся яны перадусім у самым выкананьні, часта нязвычайна ўдалым, і „казы" й „кабылы" й „жураўля", і то найпрасьцейшымі сродкамі. Каб зрабіць, прыкладам, „казу", хлапцы выварачвалі дагары воўнай кажух, усоўвалі праз адно рукаво кажуха канец дугі й завязвалі яго так, каб атрымалася нешта падобнае да галавы й шыі. Да галавы прывязвалі скручаныя з саломы рогі. Да іншага канца дугі прывязваўся саламяны-ж хвост. Пад кажух залазіў невялікі спрытны хлапчук й браў у рукі казіную „галаву". Полы кажуха павінны былі быць доўгія й закрываць ногі хлапца-„казы". Вадзіў „казу" па хатах „дзед. Ён быў таксама апранены ў кажух воўнай дагары, з гарбом на сьпіне й маскай на твары, зробленай з кавалку бярэсьціны, у якім праразаліся вочы й рот, устаўляўся нос, таксама зь бярэсьціны й да якой прычаплялася барада й вусы зь пянькі ці лёну. У рукі дзеду даваўся капшук з табакай і ёмкі кій. Каб „дзеду" ня было маркотна аднаму, рабілі, звычайна, й „маладзічку". За „маладзічку" пераапраналі танклявага, танкагалосага хлапчука, галава якога павязвалася намёткай. Пад андарак ды шнуроўку „маладзічкі", дзеля прывабнасьці, напіхалі рознага рызьзя. Часта ў спадарожнікі „казе" дадавалі яшчэ й „немца". „Немца" апраналі абавязкава ў чорныя, крамныя порткі, пазычаныя звычайна ў вясковага жыдакарчмара, камізэльку й брыль. Абводзілі сажай вочы й рот — „яго й не спазнаць"... Тады шукалі музыку. Харошы, запраўдны музыка хадзіць з „казой" не хацеў, дык бралі абы-якога, „абы рыпаць умеў".

Калі ўсё было гатовае, уся грамада ішла на вёску, сьпяваць. Бралі із сабой і механошу. Падыходзілі пад вакно й прасіліся ў гаспадара: „казы нашае пагглядзець дазвольце" або „проста „дазвольце пагуляць". Ну, іншыя пушчалі, а іншыя й не, адказвалі: „ня трэба, нашыя дзеці баяцца". Ці так што.

Калі гаспадар хаты згаджаўся пусьціць у хату „казу", дык першым пераступаў парог „дзед", вядучы за шыю „казу", за казою „немец", „маладзічка", а нарэшце ўжо сэпявакі ды музыка. Як уваходзілі, дык каза станавілася сярод хаты, а дзед хадзіў ля яе й стукаў кіем у мост (падлогу). Каля казы круціліся й немец з маладзічкаю. Сьпявакі-ж і музыкі заставаліся ля парогу. Пад іхныя песьні маладзічка й немец самперш пачыналі скакаць, а каза, стоячы, круцілася на ўсе бокі, нагамі тупала.

— „Го-го-го, каза, — сьпяваў хор —
Го-го, шэрая,
Выскач ты, коза,
Выскач, нябожа,
З цёмнага лесу
На чыстае поле.
Ой ты казіца,
Ой, гультаіца,
Узяла-б сярпок,
Пайшла-б у лясок,
Травы-б нажала,
Ды сваіх дзяток удома дзяржала..."

Але, пераважна, выступ „казы", пачынаўся зваротам да гаспадароў хаты:

— „Вось мы к вам ідзём і казу вядзём.
Нутка, козанька, расхадзіся-тка,
Усяму двару пакланіся-тка.
І гаспадару і гаспадыньцы.
Прыдзі блізенька,
Пакланіся нізенька,
Каб падарылі мерачку аўса,
Каб каза пайшла,
Мерачку жыта, каб каза сыта..."

Сьпявалі яшчэ й гэткую песьню:

— „Хадзіла каза па густых барох,
Па цёмных лясох,
А цяпер ходзе па божых дамох.
Пане гаспадар, дай чвертку аўса,
Каб наша каза высока расла,
Дай паўчверткі жыта,
Каб наша каза тым была сыта.
Як пайшла каза на капыцічках,
На капыцічках, на залоценькіх,
Усё кажучы, прыказуючы:
А дай-жа, Божа, у гэтую хату
Ды каровачку ня ўрочлівую,
Малочлівую,
Жыта каласіста,
Ядро ядраніста..."

або:

— „Хацелі козачку ды загубіці,
Скуру садраці, дуду пашыці.
Ня бойся, козачка, ні стральцоў-байцоў,
Ні ўдалых шаўцоў,
А бойся, козачка, старога дзеда.
Старога дзеда зь сівой барадой:
Ён цябе згубіць,
Скуру аблупіць,
Дуду скруціць"...

Відаць, наполохаўшыся дзеда, каза й запраўды кідала скакаць і падала вобзем.

А хор сьпяваў:

— „Тут каза ўпала, ня жыва стала.
А механоша, бяры дудачку,
Дуй казе ў жылу.
Надымае жыла,
Стала каза жыва"...

Мэкнуўшы, каза ўскаквала й пачынала ізноў скакаць:

— „Го-го-го, каза — з новай сілаю пачынаі новую песьну й сьпявакі, —
Го-го, шэрая,
Дзе ты хадзіла, дзе ты блудзіла?
— А я хадзіла, а я блудзіла
Па цёмных лясох, па шырокіх лагох,
А ў ляску, ляску на жоўтым пяску
Павалілася, аказілася.
На гары каза з казяняткамі,
Пад гарой ваўчок з ваўчыняткамі.
А ваўчок, ваўчок, за козачку чок,
А ваўчыняткі за казянаткі.
На палу жыта нагамі зьбіта,
А на печы авёс ды вялікі парос.
А ў тым жыцячку перапеліца,
Перапеліца дзяцей вывяла.
Дзе каза рогам, там жыта стогам,
Дзе каза нагой там жыта капой.
Дзе каза хадзіла, там жыта радзіла..."

На заканчэньне казіных наведзінаў сьпявалася:

— „Го-го-го, каза, го-го, шэрая,
го-го, белая.
Стань, козухна, стань, любая,
Разьвесяліся, ў ногі пакланіся.
Дасьць табе пан
Мерачку аўса, на ўзьверх кілбаса,
Тры кускі сала, шчэ таго мала,
Чацьверты пірог, каб казы сьцярог"...

Пасьля гэтае песьні каза ціхенька клалася дзе ў кутку, на падлогу, а дзед зьвяртаўся да маладзічкі й немца й тыя пачыналі скакаць „Падушачку". Паскакаўшы, дзед браў казу за шыю, падводзіў да гаспадара й гаспадыні кланяючыся й казаў: „Ну, каза, стань, расхадзіся, пану-гаспадару пакланіся". Каза кланялася, а гаспадыня дарыла яе скваркай ці лустаю пірага й казу выводзілі з хаты, накіроўваючы да суседа. Гэтак „каза" абыходзіла ўсю веску.

„Кабылу" рабілі малую й большую. Малую — з адным чалавекам і вялікую — з цыганом, дзедам і грамадою сьпявакоў. Рабілася-ж „кабыла" гэтак:

Бралі жардзіну й працягвалі яе праз два рэшаты, між якімі садзілі хлапца. Сьпераду даробялялі галаву з вушыма, а ззаду хвост, пакрываючы „кабылу" даўгой белай ці шэрай посьцілкай. Уваходзячы ў хату „цыган", выпэцканы сажай, з чырвонаю хусткаю на шыі, прапанаваў дзеду купіць „кабылу". Пачынаўся торг. Дзед лічыў вызначаную цыганом цану завялікаю, цыган хваліў свой тавар, а дзед, наадварот, шукаў у „кабыле" розных заганаў. Урэшце разгаралася спрэчка, а тады на ўцеху гледачом, і бойка. Цыган біў дзеда пугаю, дзед плакаў і галасіў, а тады гандляры білі па руках і канчалі справу. Гаспадар-жа частаваў іх гарэлкай або даваў скварку ці што іншае.

Уваходзячы ў хату з „кабылай" таксама сьпявалі:

— „Добры вечар, пане гаспадару,
Слава Богу Ваядзінаму,
Засьцілай сталы, кладзі пірагі,
Слава й г. д.
Ды будзе к табе ды трое гасьцей:
А перщы госьць цёпла сонейка,
А другі госьць — ясен месячык,
А трэці госьць — дробны дожджычак.
Мы-ж цябе, Сымоне, не зьневажаем,
Із Сьвятым Васілём паздраўляем,
Ды ні сам сабой, а з Ісусам Хрыстом,
З Ісусам Хрыстом,
Із Сьвятым Ражством,
Слава Богу Ваядзінаму!"

Пасьля песьні музыка пачынаў граць на дудцы або цымбалах, а дзед і цыган скакаць. Цыган чапляўся гаспадароў: „А ну, гаспадару, ці няма памяняць на коні? Мая сівая, як бяжыць, дык дрыжыць, а паваліцца — ляжыць. Памажы падняць. Ну, дык будзем мяняць?" Пасьля цыгана на хату выходзіў механоша: „За гэту чэсьць, — казаў ён — давай, паночку рублёў шэсьць, ды тры кускі сала, каб наша кабыла ня прыстала". Гаспадар дарыў яго й кабыла пераходзіла ў іншую хату. Калі яе не хацелі туды пусьціць, дык хлопцы сьпявалі:

— „Шчодзяр-бодзяр, Рыгорка злодзей,
Кабылку ўкраў, пад печ схаваў", і г. д.

„Мядзьвядзя" апраналі ў чорныя кажухі. Рукавы аднаго нацягвалі на рукі, а другога на ногі й зьвязвалі. На галаву націскалі чорную-ж шапку, ці абкручвалі яе чорнай аўчынкай. Твар густа пэцкалі сажай, а на шыю чаплялі вяроўку. Вуліцай мядзьведзь ішоў на нагах, але ў хату ўваходзіў ракам. Пры мядзьвядзю йшоў важака з даўгім кіем і музыка з бубнам. У хаце мядзьведзь пачынаў паказваць розныя штукі. Выпіўшы чарку гарэлкі, ён скакаў, устаўшы дубца, роў, кідаўся на нялюбых яму гледачоў пад дружны рогат сабраных.

„Журавель" хадзіў звычайна з „Медзьвядзём", радзей — адзін. Каб зрабіць яго, да высокай жардзіны даробялялася птушыная галава з даўгою, часам рухомаю глюгай, так што журавель мог разявацца й клякатаць, пад жардзіну прывешвалі мех, або палатняную посьцілку, пад якой хаваўся хлапец. Журавель, як і мядзьведзь, скакаў, дзёўб глюгаю глядачоў і строіў зь іх розныя кепікі — скідаў шапкі, балюча шчыпаў й г. д.

Найвесялей гулялі ў нас у навагодні вечар, пасьля „шчодрае", „багатае" ці „таўстое" куцьці. У гэты вечар хадзілі ізноў „із зоркаю", батлейкаю, „казою", вадзілі „кабылу", „медзьвядзя", „жураўля"... Не адставалі гэтым разам ад хлапцоў і дзяўчаты. Яны прыбіралі у гэты вечар „Шчодру".

На гэтую ролю выбіралася прыгожая, ёмкая дзяўчына. На галаву ёй клалі вянок з папяровых кветак ды йстужак. Істужак гэтых павінна было быць якнайбольш, бо трэба „каб Шчодра касматая была", што варожыць шчасьлівы, ўраджайны год. Прыбраўшы „Шчодру" ў найлепшую вопратку, дзяўчаты хадзілі зь ёю па хатах і сьпявалі калядкі-шчадроўкі:

— „У нашага пана, пана Хведара,
Радуйся Тройца, Сын Божы нарадзіўся,
На дварэ тры сталы стаялі,
За тымі сталамі тры сьвяты сядзелі.
Першае сьвята — Сьвятое Ражство,
Другое сьвята — сьвятое Васільля,
Сьвятое Васільля нам сьвята прынясло.
Трэцяе сьвята — Іван Хрысьціцель,
Іван Хрысьціцель ваду перахрысьціць,
Радуйся Тройца, Сын Божы нарадзіўся"...

або:

— „А зьбегла, зьбегла з поля старожа,
Сьвяты вечар, з поля старожа,
Ды прыбегла к Сымонку на двор,
Сьвяты вечар, к Сымонку на двор.
Ці сьпіш, ці ляжыш, малады Сымоначка?
Тваю дзяўчыну ў палон забралі
Туркі з татармі.
Туркі з татармі, баяры з баярмі"
— „А я тых баяр мячом парубаю,
А я тых турак канём патапчу,
А сваю дзяўчыну за сябе вазьму,
Сьвяты вечар, за сябе вазьму".

Дзяўчатаў таксама дарылі хто кавалкам кілбасы, хто лустаю пірага, а хто й грашыма.

У гэты-ж вечар дзяўчаты пераапраналіся „цыганамі". Аднэй начаплялі ўкачаную ў сажы бараду, малявалі сажай вусы, давалі ў рукі пугу. Іншую пераапраналі старой цыганкай „з дзіцям" — скручанай з анучаў лялькай „Сідаркай" — на руках. Рэшта апраналася ў хусткі ды йстужкі маладымі цыганкамі. Гэтак выстраіўшыся йшлі на сяло, сьпяваючы:

— „Як паехаў Халімон ды ў поле араць,
Ды забыўся Халімон хлеба-солі ўзяць.
Ата-і-ла, ата-тай, хлеба солі узяць.
А прыехаў Халімон цыганку ганяці:
Чаму мне не зваражыла хлеба-солі узяці"?... й г. д.

У хаце „цыганы" скакалі, жартавалі, варажылі, „брэшучы як праўдзівыя цыганкі"...

На другі дзень Калядаў моладзь, звычайна, спраўляла „ігрышча". Дзеўкі рыхтавалі багатую вячэру, пяклі рэшаты два бліноў, кілбасы й скваркі, праглі яешню й сыр. Дзяўчаты-ж наймалі музыкаў — скрыпку й бубен. Хлапцы прыходзілі на йгрышча ўжо ўвечары, на ўсё гатовае, прыносячы із сабою гарэлку ды піва. Пачыналіся вясёлыя, нястомныя скокі з прыпеўкамі. Скокі чаргаваліся з пачоскаю й выпіўкаю. Гэтак гулялі ўсю ноч. Скакалі на йгрышчах звычайна „Кружка" ці „Крыжачка", „Мяцеліцу", „Вераб'я", „Чыжыка", „Падушачку", а пазьней і польку ды кадрыля.

Гулялі ў Калядныя вечары і ў „Яшчура", у „Цярэшку" ды „Каралевіча". Гульня ў „Яшчура" скарыстаная ў беларускай апэрэтцы „З выраю" (лібрэта Н. Арсеньневай, музыка М. Куліковіча) й больш-менш ведамая нашаму грамадзтву. Менш ведамая й наагул дасьледваная, дзякуючы свайму характару, гульня ў „Цярэшку".

Як з усімі беларускімі каляднымі гульнямі, гэтак і з гульнёй у „Цярэшку" зьвязаныя шматлікія песьні й прыпеўкі, прыкладам:

— „Паіў я коніка ў вядрэ, пабачыў рыбачку на дне.
Смачная рыбачка язён, пацалуй дзевачка разок,
Смачная рыбачка шчучка, лёгкая мілага ручка"...

— „А здайся, Цярэшка, здайся, на другіх не заглядайся,
У кутку дзевачкі стаяць, памогуць Цярэшачку спаймаць"...

ды шмат іншых.

Гэтак гулялі некалі на Беларусі праз усе Каляды. Ці вернуцца яшчэ калі гэтыя поўныя шчырае радасьці „сьвятыя" вечары? Хто-ж ведае...

К.

Нацыянальная Канфэрэнцыя Свабоды й Міру

чаньня ў ЗША (БАЗА) у агульных дыскусіях выступаў сп. П. Манькоўскі, а ў камісіі па нацыянальных пытаньнях — сп-ня В. Жызьнеўская.

Як госьць, на канфэрэнцыі быў прысутны й прэз. М. Абрамчык, які, знаходзячыся ў гэтым часе ў Вашынгтоне, быў зацікавіўся ёю.

Сп-ня В. Жызьнеўская увайшла таксама ў дарадчую камісію Цантральнага Бюра, на чале з сп. Армстронгам, складзеную з 7-ёх асобаў.

Якую-ж мэту й заданьні ставілі сабе арганізатары канфэрэнцыі й як мы, беларусы, маем ацэньваць гэткія канфэрэнцыі з гледзішча нашых нацыянальных імкненьняў?

Вось-жа, памінаючы справы чыста амэрыканска-нутранога парадку, якія мелі на ўвеце арганізатары канфэрэнцыі, нельга не адцеміць, і то зь вялікім задаваленьнем, што канфэрэнцыі гэныя, ня гледзячы на ўсе іхныя арганізацыйныя недахопы, маюць не абыякое значаньне для ўсіх паняволеных Масквой народаў.

Папершае, арганізатары прыгаданых канфэрэнцыяў зьяўляюцца запраўды шчырымі прыхільнікамі паняволеных народаў, і шчыра хочуць дапамагчы ім, намагаючыся ўсімі сіламі выявіць перад амэрыканскай грамадзкасьцяй праўдзівы абраз трагэдыі паняволеных Масквою народаў, нічога не хаваючы й не затойваючы ды не спавіваючы яго ў нейкія нявыразныя формы.

Падругое, гэткія канфэрэнцыі, хоць яны й зьяўляюцца паводле свае формы хутчэй мітынгамі, чымся канфэрэнцыямі, — нязвычайна добрая трыбуна дзеля прапаганды нацыянальна-вызвольных імкненьняў паняволеных Масквою народаў.

Патрэцяе, нарэшце, бяручы на ўвагу ўдзел у канфэрэнцыях гэткае колькасьці паважных амэрыканскіх грамадзкіх і палітычных дзейнікаў, гэтыя мітынгі могуць у вялікай меры прычыніцца да хутчэйшага зразуменьня нашых імкненьняў амэрыканскай грамадзкасьцяй.

Да недахопаў канфэрэнцыяў трэба залічыць тое, што арганізатары іхныя за лёгкаважна ставяцца да запросінаў на канфэрэнцыі некаторых арганізацыяў, у выніку чаго й атрымоўваецца запраўднае „стаўпатварэньне" й паважных ды дэмакратычных прадстаўніцтваў і арганізацыяў нявыразнага, калі не падазронага характару, часам навет і арганізацыяў, добра ведамых усяму сьвету сваім фашыстоўскім кірункам, ці навет звычайным авантурніцтвам.

Зразумела, што гэткае зборышча ня можа ня мець адмоўнага ўплыву на аўтарытэт самой канфэрэнцыі.

Як пацьверджаньне прыгаданага, яскравым прыкладам можа быць асабліва леташняя канфэрэнцыя, дзе, як у праграме дакладаў, гэтак і ў спрэчках, а таксама й сярод прысутных у залі пераважалі дэлегаты расейскай фашыстоўскай арганізацыі Н. Т. С.

Сёлета, праўда, справа прадстаўлялася шмат лепш. Выяўленае амэрыканскай разведкай бальшавіцкае шпіёнскае гняздо ў цэнтры караўніцтва Н. Т. С. й высяленьне з Вашынгтону аднаго з правадыроў Н. Т. С. Болдырава, паменшыла сёлетнюю дэлегацыю на канфэрэнцыю да 10-ёх дэлегатаў, тады як летась іх было звыш соткі. Таму лягчэй было сёлета й з атрыманьнем голасу.

Але й у гэтым сэнсе ня ўсё было, як належыцца. Некаторыя арганізацыі, прадстаўнікі якіх стала жывуць у Вашынгтоне, патрапілі займець свае ўплывы і на канфэрэнцыі й атрымаць права голасу на гадзінныя прамовы, тады як іншым прадстаўніком пшэнціла атрымаць голас толькі зь вялікімі натугамі й то ня больш, як на пяць часінаў.

Вось гэтыя тэхнічныя недахопы, дапушчаныя арганізатарамі канфэрэнцыі, бяз сумлеву мусяць быць выпраўленыя пры арганізацыі 3-яй канфэрэнцыі, чаго павінна, бясспрэчна, дапільнаваць абраная цяпер дарадчая камісія.

М. Відук

на пагляда ў праявілася навет у дзейнасьці ведамага із сваіх прыхільных расейцам тэндэнцыяў т. зв. Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня ад Бальшавізму. Да праяваў гэтага-ж трэба залічыць і ведамую прапанову кангрэсмэна Сміта ў справе дамаганьня адкрыцьця амэрыканскіх дыпляматычных прадстаўніцтваў у Менску й Кіяве.

III.

Беларуская эміграцыя ў мінулым годзе можа запісаць на сваю карысьць таксама паважныя палітычныя асягненьні, адным зь якіх ёсьць паўстаньне супольнага блёку паняволеных народаў, т. зв. Парыскага Блёку. Натуральны супольны фронт змаганьня супроць бальшавіцкай Масквы існуе, зразумела, не ад гэтага году, а ўжо 36 гадоў, ад паўстаньня самога бальшавізму. Але гэты фронт і на землях паняволеных народаў, і на эміграцыі, ня быў каардынаваны. Стварэньне супольнага цэнтру дае першы раз магчымасьць для гэтай каардынацыі й для актывізацыі далейшага палітычнага змаганьня. Пакладзеныя правільныя, добрыя асновы для супольнай акцыі. Заданьнем будучага году — распачатую добрую справу пагглыбляць, выпаўняць канкрэтнаю дзейнасьцяй, каб мацаваць далей як і сам фронт паняволеных народаў, так і ягоную палітычна-вызвольную акцыю.

Значна пашырылася напрацягу мінаючага году й веда пра Беларусь, беларускі народ ды ягонае палітычнае значаньне як для Усходняй Эўропы, так і ўсяго вольнага сьвету. Гэта ў першую чаргу заслуга беларускай палітычнай эміграцыі, хоць спрыяў гэтаму нямала й сам кірунак агульнага палітычнага разьвіцьця.

Важкім фактам ёсьць і назначэньне Рымам адмысловага адміністратара для беларусоў-каталікоў — біскупа Слоскана. Гэты факт ня толькі сучаснага часовага значэньня. Ён мае й глыбейшую гістарычную вагу: гэта ў некаторай меры зародак адміністрацыйнай незалежнасьці беларускай каталіцкай царквы, чаго ў нас дагэтуль нябыло..

Ад'емныя праявы апошняга году, гэта эміграцыйныя сваркі. Гэта хвароба ня толькі нашай эміграцыі, але ўсіх іншых, а галоўны іхны карэнь — асабістыя дробныя амбіцыі ды справы. Адно з заданьняў будучага году, пастарацца зьменшыць гэтыя сваркі да мінімум ды паставіць нацыянальныя абавязкі й працу над усімі асабістымі няладамі.

Сумуючы гэты агляд палітычнай спадчыны 1953 году, можам сьмела сказаць, што й у вагульным сусьветным жыцьці, як і у жыцьці беларускай эміграцыі, мінулы год адзначыўся выразнаю перавагаю пазытыўных фактаў над нэгатыўнымі, што дае аснову да спадзяваньня далейшага росту вагі й значэньня беларускага пытаньня ў годзе 1954, калі, зразумела, сама беларуская эміграцыя будзе ахвярнай, працавітай, а перадусім згоднай.

Б.

АДКАЗЫ РЭДАКЦЫІ

Сп. сп. Мацукевічу й Машанскаму:

Вашыя артыкулы, напісаныя ў адказ на зьмешчаны кагадзе ў „Беларусе" артыкул „Вярні нам Беларусь" рэдакцыяй атрыманыя. Дзеля таго, што справы гэтае не хацелася-б узьнімаць якраз у Калядным нумары нашае газэты, яны адкладзеныя да наступнага.

Агулам бяручы, справа парушаная Вамі вельмі далікатная й да яе трэба падыходзіць нязвычайна асьцярожна, каб ня выклікаць сярод беларусаў рэлігійных спрэчак, якія могуць прынесьці вялікую шкоду адзінству беларусаў, як нацыі. Да гэтага часу, ня гледзячы на рэлігійны падзел беларусаў (дзьве трацiны народу праваслаўныя, адна трацiна, што складае колькі мільёнаў, — каталікі), дзякаваць Богу, у нас ніколі ня было рэлігійных антаганізмаў. Гэткі стан трэба старацца ўтрымліваць і надалей, незалежна ад прыналежнасьці да таго ці іншага веравызнаньня.

Гэты абавязак ляжыць на кажным сьведамым беларусу, як на асобах духоўных, гэтак і сьвецкіх сяброх нашага грамадзтва.

Рэдакцыя

Дзень Памяці Беларускіх Герояў

Беларускае грамадзтва Нью-Ёрку асабліва ўрачыста адсьвяткавала сёлета Дзень Памяці Беларускіх Герояў у 33-я Угодкі Слуцкага Змаганьня.

Раніцай 6-га сьнежня Яго Прэасьв. Прэасьвяшчэньнейшы Уладыка Васіль адслужыў у Царкве Сьв. Тройцы паніхіду за супакой душаў усіх, што аддалі жыцьцё за Незалежнасьць Беларусі.

Сьвяточная Акадэмія адбылася таго-ж самага дня у малой залі Карнэгі Гол.

А г. 2-й п. п. узьнялася заслона й адсланіла вачом прысутных прыгожа прыбраную сцэну: — вялікі, упрыгожаны вакол зяленівам, на фоне бел-чырвона-белага сьцягу, залаты лаўравы вянок з напісам „Тым, што памерлі, каб жыла Беларусь" у сярэдзіне.

Урачыстасьць пачалася адсьпяваньнем амэрыканскага нацыянальнага гімну.

Адчыніў Акадэмію старшыня Згуртаваньня Беларускіх Вэтэранаў у Нью-Ёрку сп. Б. Данілюк, вітаючы носьбітаў Сувэрэннасьці Беларускага Народу у ва-асобе сп. Прэзыдэнта БНР інж. М. Абрамчыка, Прэм'ера Ураду БНР сп. А. Махноўскага ды духовага апякуна беларускае эміграцыі Яго Прэасьв. Прэасьв. Уладыку Васіля, а таксама гасьцей і ўсіх суродзічаў.

Пасьля прывітаньня, у кароткай прамове сп. Данілюк выказаў значаньне урачыстасьці, што не зьяўляецца адным толькі вывам ціхое пашаны памяці нашых герояў, але ня менш яшчэ сымбалем нашай нязморанасьці у змаганьні, у імкненьні да тае Мэты, за дасягненьне якое памiралі нашыя героі.

На заканчэньне свае прамовы старшыня ЗБВ заклікаў прысутных аддаць чэсьць памяці беларускіх герояў устаньнем і хвілінай цішыні.

У гэты момант праз залю прайшла паднялася на сцэну й станула „на зважай" перад сымбалічным помнікам, што ўпрыгожваў сцэну, штандаровая тройка, з прывезеным яшчэ з Эўропы штандарам ЗБВ.

А тады загучэлі словы кароткае пярозвы памерлых змагароў:

„Слава ведамым і няведамым воям, што ў баёх і паходах ад найдаўнейшых часоў і да сяньня сваё жыцьцё аддалі ў вабароне Беларускага Народу.

Слава іменным і бязыменным змагарам, што за свабоду Бацькаўшчыны-Беларусі ў вастрогах панявольніцы і на засланьні памерлі.

Слава памятным і няпамятным, што Беларусі свае сэрцы, думкі і сілы ахвярна аддавалі й на становішчах нацыянальнага абавязку ў вечкасьць адышлі.

Слава ўсім, што ніколі, навет у найчарнейшыя часіны варожай навалы ня гублялі веры ў імкненьні да Незалежнага Беларускага Гаспадарства.

Слава тым, што памерлі, каб жыла Беларусь".

Усьлед за гэтым хор пачаў пяяць жальны марш і калі пачуліся словы "...нясены веры Табою, нізка сьхіліўся штандар...", штандар ЗБВ пахіліўся перад лаўравым вянком, сымбалем славы беларускіх герояў.

Пасьля ўрачыстага адданьня чэсьці памяці герояў, на сцэну узышоў сп. Прэзыдэнт Рады БНР інж. М. Абрамчык і ў палкай прамове выказаў упэўненасьць, што Дзень, лятуцеючы аб якім, змагаючыся за набліжэньне якога, аддавалі жыцьцё нашыя нязьлічоныя героі, Дзень Аднаўленьня Незалежнасьці Беларусі ужо недалёкі.

Пасьля гэтага выступалі з прывітаньнямі госьці.

Былі таксама прачытаныя пісьмовыя прывітаньні ад Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня ад Бальшавізму, Вэнгерскае Нацыянальнае Рады, ды ад некаторых беларускіх дзеячаў.

Пасьля прывітаньняў, сп. Г. Паланевіч прачытаў прыгожы рэфэрат.

Трэба адзначыць, што Пав. Рэфэрэнт у сьцíслым, ды адначасна вычэрпным рэфэраце, патрапіў уняць падзеі нашага мінулага, разшыфраваць іхнае значаньне і зьвязаць з сучаснасьцю, ускалыхнуць душы слухачоў, як гэта дасюль мала каму з нашых рэфэрэнтаў удавалася.

Мастацкую частку акадэміі пачаў мяшаны хор Нью-Ёркскага Аддзелу Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў Амэрыцы пад кіраўніцтвам сп-чні Г. Ганчарэнка, адпяўшы „Марш беларускіх партызанаў" — апр. камп. А. Карповіча і „Ідуць жаўнеры беларусы" — П. Мядзьведзкага.

Пасьля гэтага дацэнт Менскае Кансэрваторыі сп-ня Е. Зубковіч адыграла на фортэпіяна „Прэлюдыю" камп. Міхайлоўскага і „Бальляду" камп. А. Карповіча. Мастацкае выкананьне сп. Зубковіч ды адпаведная да характару ўрачыстасьці жальная музыка „Прэлюдыі" ды асабліва блізкая сэрцу, пабудаваная на беларускай народнай песьні „Пальночак", „Бальляда" камп. А. Карповіча застануцца на доўга ў памяці прысутных. Захапленьне слухачоў дазваляе спадзявацца, што сп. Зубковіч у недалёкай будучыні ізноў усьцешыць нас ў вадумысловым выступе.

Далей сп-чня Г. Орса з пачуцьцём прадэклямавала верш А. Салаўя.

У наступным нумары праграмы, шырака ведамая выдатная выканальніца беларускіх народных песьняў сп-ня Б. Вежбаловіч, пад акампаніямэнт сп-ні Е. Зубковіч, прапяяла колькі народных песьняў, галоўна із жаўнерскай тэматыкай, як „Ой, арол ты, арол", „Камарыкі" і „Рэкруцкую". Дзеля дамаганьняў аўдыторыі сп-ня Вежбаловіч засьпявала яшчэ на біс адну з найчараўнейшых песьняў, што стварыў Беларускі Народ „Ой, у лузе, лузе, чырвона каліна стаяла".

Сьледам за гэтым сп. Б. Данілюк прадэклямаваў верш Н. Арсеньневай „У Слуцкія Угодкі".

Наступна дзьве маладыя сьпявачкі, сп-чня Г. Дарашэвіч і сп-чня А. Орса, пад акампаніямэнт сп-ні Е. Зубковіч, прасьпявалі дуэтам „Непагодны вечар" муз. камп. Самохіна на сл. М. Багдановіча і „О, Беларусь, маз шыпшына" муз. камп. М. Куліковіча на сл. У. Дубоўкі. Нельга тут не адцеміць, што абедзьве выканальніцы былі зусім заслужана вельмі цёпла прынятыя слухачамі. Выступ іхні быў на ўздоўні прафэсыйнага мастацтва і можна спадзявацца, што маладыя сьпявачкі яшчэ шмат чым пацешаць беларускага слухача, а таксама, маючы да гэтага ўсе дадзеныя, годна зарэпрэзэнтуюць беларускую музыку і перад амэрыканскім грамадзтвам, калі трапіцца нагода.

На заканчэньне праграмы яшчэ раз выступіў мяшаны хор Нью Ерскага Аддзелу З. Б. М. А., які выканаў народныя песьні "Разьвівайся сыры дубе" і "Міма садзіка", апошная ў апр. камп. М. Равенскага, а таксама "Песьню Каліноўцаў" муз. камп. М. Куліковіча на сл. Н. Арсеньневай. Нядаўна зарганізаваны хор, не зважаючы на вельмі цяжкія умовы працы, паказаў сябе з найлепшага боку, за што дырыгэнту С-пчні Г. Ганчарэнка і ўсім харыстым належыцца справядлівая пахвала.

Закончылася ўрачыстасьць адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну.

Гэтак вось, урачыста й паважна, згодна із характарам сьвята, высьцерагаючыся танных, мітынговых эфэктаў, адзначыла Дзень Памяці Беларускіх Герояў у 33-я Угодкі Слуцкага Змаганьня згуртаваная пад сьцягам БНР беларуская грамадзкасьць Нью-Ёрку.

Прысутны

АДДЗЕЛ БАЗА ДЭТРОЙТ

просіць нас надрукаваць сьпіс асобаў, якія зласкілі ахвяры на „Калядны Падарунак" для беларусаў у Нямеччыне.

Усім Паважаным ахвярадаўцам Аддзел БАЗА у Дэтройце складае сваю найшчырэйшую падзяку. З усіх зьбіральнікаў асабліва падзяка належыцца сп. сп. Янку Скуратовічу, Паўлу Куляшу ды Станіславу Татарыновічу.

1. Чэртко Міхась, Юрка, Тарэса	$ 10
2. Фосс Мікола	$ 10
3. Кулещ Паўла	$ 10
4. Сердечэнка Мікола	$ 5
5. Татарыновіч Станіслаў	$ 5
6. Трапэза Тодар	$ 5
7. І. В.	$ 5
8. З. Я.	$ 5
9. С. П. Т.	$ 5
10. Ткачоў Мікола	$ 4
11. Сажыч Язэп	$ 3
12. Лубнік Васіль	$ 2
13. Лубнік Янка	$ 2
14. Дзямешка Сьцяпан	$ 2
15. Гардынец Арсень	$ 2
16. Пляскач Васіль	$ 2
17. Лахнюк Міхась	$ 2
18. Дуб Юрка	$ 2
19. Шышкоўскі Александар	$ 2
20. Зайтовіч Мікола	$ 2
21. Лычкоўскі Александар	$ 2
22. Гоздзельскі Станіслаў	$ 2
23. Русецкі Мікола	$ 2
24. Шацько Антон	$ 2
25. Шаўчэнко Якаў	$ 2
26. Невядомы Пётра	$ 2
27. Палхоўскі Александар	$ 2
28. Скуратовіч Янка	$ 2
29. Одынец Стэфанія	$ 2
30. С. Т.	$ 2
31. М. Г.	$ 2
32. Буян Янка	$ 2
33. Блоцкі Стафан	$ 2
34. Пруска Марыя	$ 1
35. Базуро Юрка	$ 1
36. Карповіч Антон	$ 1
37. Валынец Янка	$ 1
38. Вайтовіч Якаў	$ 1
39. Бацэнко Трахім	$ 1
40. Ковалёнак Пётра	$ 1
41. Чорны Янка	$ 1
42. Янкоўскі Янка	$ 1
43. Я. Г.	$ 1
Усяго разам	$ 123.00

З Беларускага Жыцьця

ДА ВЕДАМА СЯБРОЎ РАДЫ БНР

Даводзіцца да ведама сяброў Рады БНР, што наступнае паседжаньне 7-ае Сэсіі Рады адбудзецца ў нядзелю 10-га студзеня. Пачатак паседжаньня а 10 гадз. раніцы ПУНКТУАЛЬНА. Паседжаньне адбудзецца ў тым самым, што й заўсёды памешканьні: Premier Palace, 505 Саттэр Эвэню, Бруклін 7,

Лістовыя паведамленьні на гэты раз рассылацца ня будуць.

Прэзыдыюм Рады

5-ТЫ КАНГРЭС БАЗА

Паводле пастановы Галоўнае Управы БАЗА, 5-ты Кангрэс БАЗА адбудзецца ў Нью-Ёрку 20-га й 21-га лютага 1954 году у залі пад царквой сьв. Тройцы, 4-ая Іст вуліца у Нью-Ёрку.

Выбарчыя інструкцыі будуць разасланыя аддзелам БАЗА ў сваім часе.

Галоўная Управа БАЗА запрашае на Кангрэс, апрача дэлегатаў ад аддзелаў, якія будуць мець права вырашальна а голасу, і ўсіх наагул сяброў БАЗА з правам дарадчага голасу, а таксама й усіх іншых беларусаў, як гасьцей.

Галоўная Управа БАЗА.

ЗЬ ДЗЕЙНАСЬЦІ БЕЛАРУСКАГА СТУДЭНЦКАГА ТАВАРЫСТВА

Пры пасярэдніцтве аднае зь сяброек Беларускага Студэнцкага Таварыства ў ЗША, якая наведвае жаночы каледж пры Унівэрсытэце ў Нью-Брансьвіку й бярэ актыўны ўдзел у працы Міжнацыянальнага Клюбу пры гэтым Унівэрсытэце, беларускія студэнты былі запрошаныя прыняць удзел у вечары, ладжаным штомесяца згаданым Клюбам.

Вечар адбыўся 11-га сьнежня г. г. У ягоную праграму, апрача нумароў у духу надыходзячых калядных сьвятаў, увайшлі й нумары, выкананы нашымі студэнтамі: кароткая інфармацыя аб Беларусі, ейным гістарычным шляху й сучасным становішчы, аб нашай культурнай спадчыне й нашай ролі на ўсходзе Эўропы, пасьля чаго мяшаны хор беларускае моладзі й дзявочы ансамбль выканалі шэраг беларускіх калядак і народных песьняў, зь якіх асабліва энтузыястычна была сустрэтая амэрыканскімі слухачамі беларуская калядная жартаўлівая песьня „Антон казу вядзе". Гучныя воплескі й пазьнейшыя афіцыйныя й прыватныя выказваньні прысутных дазволілі зрабіць высноў, што беларуская праграма, задэманстраваная на вечары нашай моладзьдзю, хоць насьпех укладзеная, зрабіла неспадзяванае й глыбокае ўражаньне на шматнацыянальную, але з перавагаю амэрыканцаў, аўдыторыю.

Як старшыня Клюбу, гэтак і шмат хто з прысутных, дзякуючы за выступ, вельмі прасілі Беларускае Студэнцкае Таварыства ў ЗША зладзіць пры нагодзе вечар падобнага характару імпрэзу ў рамах дзейнасьці памянёнага Клюбу.

Студэнт

ПАДЗЯКА

Згуртаваньне Беларускіх Вэтэранаў у Нью Ерку выказвае гарачую удзячнасьць Сп-ні Дац. Е. Зубковіч, Сп-ні Б. Вежбаловіч, Сп-чнам Г. Дарашевіч, А. Орса і Г. Орса за упрыгожаньне Сьвяткаваньня Памяці Беларускіх Герояў у 33-я Угодкі Слуцкага Змаганьня мастацкімі інструмэнтальнымі й вакальнымі выступамі ды дэклямацыяй.

Таксама шчырую падзяку складае ЗБВ сп. Г. Паланевічу за апрацаваньне ўдалага рэфэрату.

Аднолькава ўдзячнае З. Б. В. і харыстым мяшанага хору Нью Ерскага Аддзелу ЗБМА на чале з дырыгэнтам Спчнай Г. Ганчарэнка за прыгожы выступ на ўрачыстасьці.

Урад З. Б. В. Нью Ерк

ШУКАЮЦЬ

Рагацэвіча Юльяна й Рагацэвіча Фэлікса, якія нарадзіліся ў вёсцы Адамава, Вішнеўскай вол., Валожынскага павету й выехалі ў Амэрыку ў 1918-1919 г., асяліўшыся, быццам, у Нью-Ёрку, шукае Язэп Рагацэвіч, сын Сымона.

Весткі просім слаць на гэткі адрыс:

Asociacion Bielorrussa en la Argentina, c. Coronel Sayon 2981, Valentin Alsina, Buenos Aires — Argentina.

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ І ПАШЫРАЙЦЕ ГАЗЭТУ „БЕЛАРУС".

БЕЛАРУСЫ У ГАСЬЦЕХ У АРГАНІЗАЦЫІ МАЛАДЫХ ХРЫСЬЦІЯНК (IWCA) У НЬЮ-ЁРКУ

Арганізацыя Маладых Хрысьціянак у Нью-Ёрку, жадаючы навязаць бліжэйшую лучнасьць з новапрыбылымі ў ЗША з Эўропы эмігрантамі, наладзіла была 18-га сьнежня 1953 г. сяброўскі вечар у сваім вялізарным будынку на 3-яй Эвэню ў Брукліне. На вечар гэты як амэрыканцам, гэтак і нацыянальным арганізацыям б. ДП было разаслана ўправай IWCA звыш 200 запросінаў. На вялікі жаль, скарыстала зь іх толькі невялікая частка запрошаных. Найбольш было на вечары беларусаў.

На мастацкую частку сяброўскага вечару, ладжанага IWCA-й склаліся выступы розных нацыянальнасьцяў. Пасьля канцэрту-ж была падана гарбата, а потым пачаліся танцы.

Ад беларусаў у мастацкай частцы вечару ўдзельнічала нашая нястомная моладзь з ЗБМ і ня менш нястомная й ахвярная нашая вядомая опэрная сьпявачка Барбара Вержбаловіч. Яна выканала, як першы нумар праграмы, некалькі беларускіх народных песьняў, пачынаючы ўсё прыгожаю беларускай калядкай: „Ой, у лузе, лузе красна каліна"... Усе песьні былі прасьпяваныя ёю зь нязвычайным натхненьнем і зрабілі на слухачоў амэрыканцаў ды іншанацыянальных наведвальнікаў вечару вялікае ўражаньне. Пасьля гэтага выступала нашая моладзь, дзявочы ансамбль, які таксама вельмі ўдала выканаў колькі беларускіх народных песьняў, а пасьля колькі параў, што з узьдымам адскакалі „Лявоніху".

Усім нашым удзельнікам, якія ізноў гэтак удала прычыніліся да прапаганды нашага імя й нашага мастацтва сярод чужынцаў, належыцца якнайшчырэйшая падзяка ўсяго нашага грамадзтва.

Раўнуючы да беларускага выступленьня, выступленьні іншых выпалі шмат слабей, хоць гэтаксама міла й шчыра. Таксама і ў танцах, якія пачаліся пасьля спажытае із здаровым маладым апэтытам гарбаткі, узялі ўдзел пераважна нашыя маладыя танцоры ды танцоркі.

— „Гэта быў напраўдзе беларускі, а не міжнацыянальны вечар", сьмяючыся дзякавалі, разьвітваючыся нашым удзельнікам і арганізатарам кіраўнікі арганізацыі IWCA. — „і трэба заценіць, вечар нязвычайна удалы!"

Госьць

ФОНД УСХОДНЯЕ ЭЎРОПЫ

паведамляе праз свайго дырэктара сп. Давіда С. Мунфорда, аб тым, што беларускія студэнты, якія вучацца ў амэрыканскіх высокіх школах могуць старацца стыпэндыяў на 1954-55 акадэміцкі год.

Кандыдаты мусяць паходзіць з заняты сяньня Саветамі усходніх краінаў якія яны пакінулі пасьля 1939 году, жыць у ЗША, быць не старэйшымі за 35 год і ведаць ангельскую мову, а таксама ужо быць запісанымі на ўнівэрсытэт ці каледж, накш кажучы, быць студэнтам аднае з высокіх амэрыканскіх школаў.

Заявы будуць разглядацца й стыпэндыі вызначацца адмысловым Сэлекцыйным Камітэтам, складзеным з прадстаўнікоў амэрыканскага навуковага сьвету, а таксама з прадстаўнікоў навукі паняволеных народаў, у тым ліку й прадстаўнікоў ад беларусаў.

Блянкі заяваў і інфармацыі зацікаўленыя студэнты могуць атрымаць, зьвярнуўшыся лістоўна (паангельску) у Фонд Усходняе Эўропы —

East European Fund, 10 East 44 Str., New York 17, N. Y.

Заявы павінны быць складзеныя не пазьней першага сакавіка 1954 г. Заявы, атрыманыя пазьней разгледжаныя ня будуць.

ПАДЗЯКА

Аддзел Сацыяльнае Апекі БАЗА шчыра дзякуе ўсім тым, хто ахвяравалі грошы й вопратку на „Калядны падарунак" нашым суродзічам у Нямеччыне.

За сабраную вопратку асаблівая падзяка належыцца сп. сп. Я. Каханоўскай, Бунчуку, А. Сав., Р. Казаку, Сьлесарэнку, Дуранковай, Я. Г., І. Емельяновічу, Красоўскаму, Захаркевічу, Г. Ганчарэнка.

Пачкі з вопраткай разьмяркаваныя гэтак:

9 вялікіх пачак — у Беларускі Камітэт у Нямеччыне.
1 пачка — кампазытару Карповічу.
1 пачка — ў Аўстрыю.
1 пачка — ў Беларускі Камітэт у Францыі.

Апрача гэтага Аддзелам Сацыяльнае Апекі БАЗА сабраныя на падпісныя лісты грошы, на „Калядны падарунак ад гэткіх асобаў:

Сп. Я. Каханоўскай	$ 5.00
Сп-ства Вадэйкаў	$ 5.00
Сп. Вержбаловіч	$ 5.00
А. Амельяновіч	$ 1.00
П. М.	$ 1.00
В. Тумаша	$ 5.00
Я. Ліманоўскага	$ 1.00
Р. Казака	$ 2.00
Я. Юхнаўца	$ 0.50
А. Шукелайця	$ 2.50
М. Рагулі	$ 10.00
Сп. Панасені	$ 1.00
Г. Паланевіча	$ 2.00
Д. Клінцэвіча	
(для дзяцей Трусава)	$ 5.00
(у Нямеччыну)	$ 5.00
П. Зыбайлы	$ 3.00
Сп. Махнача з Чыкага	$ 5.00
Сп. Маркоўскага	$ 2.00
Сп. Казьлякоўскага	$ 2.00
Сп. Заморскага	$ 2.00
Сп. Юрцэвіча	$ 2.00
М. Пятрусэвіча	$ 1.00
Я. Г.	$ 2.00
Сп. Красоўскага	$ 1.00
Я. Емельяновіча	$ 1.00
В. Захаркевіча	$ 2.00
Б. Емельяновіча	$ 1.00
П. Мельяновіча	$ 2.00
В. Паланевіча	$ 1.00
Я. Грунько	$ 2.00
Ф. Кушаль	$ 5.00
Сп. Дудкі	$ 1.00
Сп. Пецька	$ 1.00
Сп. Лапіцкі	$ 1.00
Я. Крэсла	$ 2.00
Ул. Русак	$ 2.00
Церашкевіч	$ 1.00
Я. Ніхаёнак	$ 5.00
Разам	$ 96.00

Аддзел СТАМФОРД пераслаў Беларускаму Камітэту ў Нямеччыне

Ад А. Протаса	$ 5
П. Ганецкага	$ 3
В. Кажана	$ 3
Сп-ства Галякоў	$ 5
Разам	$ 16

Грошы на „Беларуса" прыслалі:

Я. Гладкі	$ 2
Сяргей Красоўскі	$ 5
Я. Юхнавец	$ 1
Разам	$ 8

НА ФОНД НАБЫЦЬЦЯ БЕЛАРУСКАГА ДОМУ ПАСТУПІЛА:

Б. Даніловіч	$ 50
З папярэднімі	$ 2275

Грошы у Фонд просіцца слаць на адрыс скарбніка Фонду сп. Д. Клінцэвіча **541-51 Warwick St. Brooklyn 7.**

АДДЗЕЛ САЦЫЯЛЬНАЙ АПЕКІ БАЗА

ладзіць

КАЛЯДНУЮ ЯЛІНКУ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ДЗЕТАК

У НЯДВЕЛЮ 10-га СЬНЕЖНЯ 1954 г. а гадз. 3 папаўдні

У праграме Ялінкі — Дзіцячы канцэрт, Дзед Мароз з падарункамі, песьні, танцы й смачны падвячорак.

Уваход вольны.

Ялінка адбудзецца ў залі

IWCA — 30, 3rd Ave, рог Atlantic Ave, Brooklyn
(Даезд па IRT ці BMT да станцыі Atlantic Ave.)